*Уладзімір ЛАДЫСЕЎ*

# ДА ПЫТАННЯ БЕЛАРУСКА-УКРАІНСКІХ УЗАЕМААДНОСІН У ПЕРЫЯД СТАНАЎЛЕННЯ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ І ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЙ ЦЭЛАСНАСЦІ БЕЛАРУСІ

Украіна і Беларусь – дзяржавы цесна звязаныя агульным лёсам і гісторыяй. У навейшы час, як і на папярэдніх этапах свайго развіцця, яны неаднойчы знаходзіліся ў эпіцэнтры падзей, што аказвала значны ўплыў на ход еўрапейскай гісторыі. Існаванне незалежных дзяржаў Украіны і Беларусі выклікае цікавасць да праблематыкі беларуска-украінскіх узаемаадносін пачатку ХХ стагоддзя.

У адрозненне ад Украіны станаўленне дзяржаўнасці Беларусі праходзіла ва ўмовах незавершанасці працэсу фарміравання беларускай нацыі, слабасці эканамічных пазіцый беларускай нацыянальнай буржуазіі. Гэта накладвала адмоўны адбітак на дзяржаваўтваральны працэс і складыванне тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі. Невыпадкова Украінская Цэнтральная рада пасля абвяшчэння ў лістападзе 1917 г. адзінай уладай на Украіне выказала намер далучыць да Украінскай рэспублікі паўднёвыя этнічныя беларускія землі.

Працэс самавызначэння Беларусі паскорыўся пасля апублікавання 2 лістапада 1917 г. “Дэкларацыі правоў народаў Расіі”, якая на думку дзеячаў беларускага нацыянальнага руху дэмакратычнага напрамку давала юрыдычную падставу для набыцця незалежнасці Беларусі. Але скліканы Вялікай беларускай радай у снежні 1917 г. Першы Усебеларускі з’езд, які прыняў рашэнне аб самавызначэнні Беларусі, быў разагнаны бальшавікамі.

Знаходзячыся на паўлегальным становішчы Выканкам Савета з’езда здолеў паслаць дэлегацыю на мірныя перагаворы ў Брэст-Літоўск у складзе С.Рак-Міхайлоўскага і А.Цвікевіча, якая прысутнічала на перагаворах у якасці дарадцаў украінскай дэлегацыі. Ва ўмовах акупацыі большай часткі Беларусі войскамі кайзераўскай Германіі, калі савецкія органы ўлады эвакуіраваліся ў Смаленск, Выканаўчы камітэт Рады Першага Усебеларускага з’езда 20 лютага і 9 сакавіка 1918 г. выдаў першую і другую Устаўныя граматы, у якіх абвясціў сябе часовай уладай на Беларусі да склікання Усебеларускага ўстаноўчага сойму[1], а Беларусь абвяшчалася Народнай Рэспублікай у межах рассялення і лічбеннай перавагі беларускага народу[2].

Складанасць сітуацыі заключалася ў тым, што абвешчаная БНР не адносілася ў той момант да тых новых дзяржаўных утварэнняў, як напрыклад Украінская Народная Рэспубліка (УНР), з якой урад кайзераўскай Германіі афіцыйна заключыў мір, ці ўступіў у саюзныя адносіны, як гэта было зроблена з Літвой. Таму ў вы-

дадзенай 25 сакавіка 1918 г. трэцяй Устаўной грамаце гаварылася пра аддзяленне Беларусі ў этнічных межах ад Расіі і прызнанне несапраўднымі палажэнні Брэсцкага мірнага дагавору ў частцы, якая закранала Беларусь.

Пытанне тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі было пастаўлена невыпадкова. Паводле дагавору прадстаўнікоў Германіі і УНР тэрыторыя Гомельскага, Пінскага, Кобрынскага і частка Пружанскага паветаў на поўдзень ад Палескай чыгункі пераходзілі пад уладу УНР. Канчатковае ўстанаўленне граніцы Беларусі і Украіны павінна было стаць прадметам асобных перагавораў.

Таму 18 красавіка 1918 г Народны сакратарыят БНР звярнуўся з радыёграмай у Міністэрства замежных спраў УНР з прапановай хутчэйшага стварэння камісіі, сумесна з якой дэлегацыя па справах знешніх перамоў БНР змагла б дакладна ўстанавіць межы і “замацаваць у асобным дагаворы дзяржаўныя межы абеіх Рэспублік”[3].

Рэакцыя ўрада УНР на радыёграму Народнага сакратарыята была хуткай. Як сведчыць пратакол пасяджэння дэлегацыі Народнага сакратарыята БНР ад 20 красавіка, сярод членаў якой панавала эйфарыя на хуткае і дадатнае вырашэнне гэтага пытання, адбыліся дзве сустрэчы з украінскай камісіяй па размежаванню ў складзе А.В.Ліхнякевіча, М.В.Петрыўскага і М.А.Свідзерскага. Прадстаўнікі УНР пагадзіліся на частковыя змены мяжы на тэрыторыі Чарнігаўшчыны, аднак далей на захад адмовіліся абмяркоўваць, спасылаючыся на тое, што мяжа вызначына ў мірным дагаворы з Германіяй[4].

У якасці першых пазітыўных практычных крокаў па вырашэнню пытання аб паўднёвых паветах Беларусі было вырашана назначыць беларускіх камісараў у Мазырскі, Пінскі і Гомельскі паветы. Было таксама прызнана мэтазгодным на пасяджэнні дэлегацыі Народнага сакратарыята звярнуцца да міністра ўнутраных спраў УНР з просьбай, каб украінскім камісарам былі даны інструкцыі весці “працу ў цесным кантакце з беларускімі камісарамі, якія будуць з’яўляцца прадстаўнікамі беларускага ўрада”[5].

У мэтах усталявання больш цесных палітычных і эканамічных сувязяў з УНР у Кіеў 26 мая 1918 г. у якасці надзвычайнага ўпаўнаважанага Рады БНР быў накіраваны вядомы беларускі нацыянальны дзеяч Р.Скірмунт для перагавораў з прыйшоўшым да ўлады 29 красавіка гетманам Скарападскім. Урад Скарападскага яшчэ больш інтэнсіўна стаў праводзіць палітыку анексіі паўднёвых зямель Беларусі. Нягледзячы на тое, што ўкраінскі ўрад адцягваў пытанне аб заключэнні дагавора паміж УНР і БНР і прадаўжаў палітыку ўкраінізацыі насельніцтва беларускіх паветаў, у Кіеве было адчынена генеральнае консульства БНР. Яго ўзначаліў з 29 мая П.В.Трамповіч.

У перыяд з сакавіка па лістапад 1918 года Народны сакратарыят і Рада БНР зрабілі першыя крокі па ўстанаўленню рэальнай беларускай дзяржаўнасці і дыпламатычных адносін з іншымі краінамі. Акрамя Украіны беларусы кантактавалі з Літвой, Каралеўствам Польскім, Германіяй. Консульствы БНР былі створаны ў Кіеве, Адэсе і Маскве.

Але найбольш цесныя палітычныя і эканамічныя сувязі ўстанавіліся з Украінскай Народнай Рэспублікай. Так у Мінску было адчынена консульства УНР. У мэтах наладжвання тавараабмену паміж Украінай і Беларуссю 24 красавіка 1918 года Народны

сакратарыят зацвердзіў статут і асабісты склад Беларускай гандлёвай палаты на Украіне. Як паведамляла газета “Вольная Беларусь”, “палата мае мэтаю наладзіць абмен тавараў паміж Беларуссю і Украінай і першым чынам арганізаваць закупку хлеба, дапамагаць перавозцы яго і іншых прадуктаў для Беларусі”[6].

Гандлёвая прамысловая палата складалася з 12 чалавек. У склад яе кіраўніцтва ўвайшлі вядомы беларускі нацыянальны дзеяч М.Доўнар-Запольскі (старшыня), Ф.Бурчак (намеснік), члены праўлення: Р.Базаркевіч, І.Курыловіч і Р.Хорчэт (сакратар).

Улічваючы цяжкае эканамічнае становішча насельніцтва Беларусі, у мэтах пашырэння эканамічных сувязяў 25 красавіка была створана Беларуская цэнтральная гандлёвая палата на чале з членам Рады БНР П.Крэчэўскім. Галоўнай яе задачай было садзейнічанне і рэгуляванне тавараабмену паміж Беларуссю і суседнімі дзяржавамі: Германіяй, Украінай, Расіяй, Літвой падтрымка і развіццё прамысловасці. Вярхоўнаму германскаму камандаванню 10 арміі была накіравана дакладная запіска, у якой прапаноўвалася:

дазволіць гандлёвай палаце вывозіць з Беларусі для абмену лясныя матэрыялы, запалкі, лён і іншую сыравіну па водных і чыгуначных шляхах;

дазволіць прывоз тавараў спажывання, а менавіта: хлеба, мукі, крупы, цукру, табаку, тлушчу і іншых прадметаў з Украіны;

дазволіць свабодны праезд членам гандлёвай палаты, а таксама камандыраваным ёю асобам паводле спецыяльных пасведчанняў, выдадзеных палатаю;

дазволіць паштова-тэлеграфную сувязь;

змякчыць загад, які абмяжоўваў свабодны гандаль сыравінай, паўфабрыкатамі, гатовымі фабрычнымі, ляснымі матэрыяламі і палівам.

У сувязі са спрыяльным вырашэннем пытання ў жніўні 1918 г. аб тым, што ўсе тавары, якія ідуць на адрас Палаты з Расіі, Украіны і іншых дзяржаў, не будуць рэквізіравацца акупацыйнымі ўладамі, прадугледжвалася наладзіць гандлёвыя сувязі з Германіяй, Расіяй, Украінай і іншымі дзяржавамі. У Беларускую гандлёвую палату пачалі паступаць заказы на пастаўку тавараў з Украіны і Расіі.

3 верасня 1918 г. ў Кіеў для заключэння гандлёвага пагаднення была накіравана спецыяльная ўрадавая дэлегацыя БНР у складзе старшыні Беларускай цэнтральнай гандлёвай палаты П.Крэчэўскага і Народнага сакратара гандлю і прамысловасці Ф.Вернікоўскага. З украінскім урадам была дасягнута поўная згода аб тавараабмене. У абмен на украінскую муку, цукар, мыла ўрад БНР абавязваўся пастаўляць лесаматэрыялы, дровы, запалкі. Усе тавары і прадукты, якія вывозіліся з Украіны на Беларусь, павінны былі праходзіць цераз Беларускую гандлёвую палату ў Кіеве і там рэгістравацца з умовай зніжэння пошліны і цэн на тавары. Згода міністра гандлю і прамысловасці Украіны на рэгістрацыю і вываз тавараў толькі цераз Кіеўскую Беларускую гандлёвую палату паставілі на чаргу пытанне аб волонаабмене. І па гэтаму пытанню з міністэрствам шляхоў зносін была дасягнута згода.

Далейшай задачай Цэнтральнай Беларускай гандлёвай палаты з’яўлялася замацаванне дасягнутых пагадненняў цераз дазвол на іх ажыццяўленне нямецкіх акупацыйных улад[7]. Немцы прызналі дамоўленасць, абяцаючы вызваліць тавары ад рэквізіцыі, што перавозіліся па чыгунцы[8]. У Мазыры, Лунінцы, Рэчыцы, Гомелі, Полацку і Оршы Беларуская цэнтральная гандлёвая палата адкрыла рэгістрацыйныя

пункты тавараў. Такім чынам, урадавымі структурамі БНР былі зроблены першыя практычныя крокі ў сферы гандлю. У пачатку 1919 г. улады Украіны пагадзіліся даць беларусам грашовую пазыку на суму ў 1,5 млн. нямецкіх марак[9].

Вялікія надзеі палітычныя дзеячы БНР ускладалі на кіраўніцтва УНР у вырашэнні пытання дыпламатычнага прызнання БНР. Невыпадкова прадстаўнікі БНР настойліва дамагаліся прызнання тэрытарыяльных межаў з Украінай. Бо гэта ўскосна азначала прызнанне дэ-юрэ дзяржаўнасці БНР. Пачынаючы з красавіка 1918 г. гэтае пытанне ўздымалася неаднаразова. 19 верасня надзвычайная беларуская дэлегацыя прыехала ў Кіеў дзеля вырашэння пытання аб афіцыйным прызнанні незалежнасці беларускай дзяржавы, стварэнні беларускага войска. Міністр замежных спраў УНР Д.Дарашэнка прыхільна ставіўся да вырашэння пытання аб прызнанні дэ-юрэ БНР. 9 кастрычніка дэлегацыя была прынята гетманам Скарападскім, які “заверыў аб сваёй прыхільнасці да незалежнасці беларускай дзяржавы”[10], абяцаў разгледзіць у хуткім часе на Радзе міністраў пытанне аб прызнанні БНР. Аднак так і не дачакаўшыся станоўчага вырашэння пытання дэлегацыя ў складзе члена Рады БНР А.Аўсяніка, Г.Базарэвіча і Капыстынскага, узначальваемая прэм’ер-міністрам БНР А.Луцкевічам, вымушана была 4 лістапада вярнуцца безвынікова ў Мінск. Як бачна, пытанне аб афіцыйным прызнанні БНР, як і яе паўднёвых тэрытарыяльных межаў украінскім урадам не было вырашана.

Цікава, што пытанне аб паўднёва-заходніх межах Беларусі і Украіны ізноў было пастаўлена на абвестку дня ў савецкі час у верасні 1939 г., пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР, а Заходняй Украіны да УССР. Узнікла праблема разгранічэння паўднёва-заходніх раёнаў Беларускай ССР і адпаведных раёнаў Украінскай ССР у сувязі з неабходнасцю зацвярджэння іх Вярхоўным Саветам СССР. Яшчэ 19 кастрычніка 1939 г. ў адпаведнасці з пастановай Бюро ЦК КП(б)Б Украінскай ССР быў перададзены Камень-Кашырскі павет, які меў у сваім складзе пераважную большасць украінскага насельніцтва[11]. Але такое вырашэнне тэрытарыяльнага пытання паміж Украінай і Беларуссю не задавальняла тагачаснага першага сакратара Кампартыі Украіны М.С.Хрушчова. Таму паміж первым сакратаром Кампартыі Беларусі П.К.Панамарэнкам і М.Хрушчовым узніклі сур’ёзныя супярэчнасці па пытанню аб межах. У прадстаўленым на разгляд І.Сталіну праекце М.Хрушчова граніца паміж заходнімі абласцямі Украіны і Беларусі праходзіла не па натуральнай этнаграфічнай мяжы, а значна паўночней. У выніку гарады Брэст, Пружаны, Столін, Пінск, Лунінец і Кобрын, а таксама большая частка Белавежскай пушчы адыходзілі да Украіны[12].

Але на нарадзе 22 лістапада ў І.Сталіна, нягледзячы на супраціўленне Хрушчова, яго праект быў адхілены. За аснову быў прыняты праект Панамарэнкі, які прадугледжваў этнічную мяжу паміж рэспублікамі з невялікімі адхіленнямі ў раёне Белавежскай пушчы, як адзначалася ў пастанове, “у адпаведнасці з жаданнямі ўкраінцаў атрымаць нямнога лесу”. Гэты эпізод адмоўна адбіўся ў далейшым на адносінах паміж П.Панамарэнкам і М.Хрушчовым.

Такім чынам, менавіта Украіна з’явілася першай дзяржавай, якая аказала рэальную эканамічную і палітычную падтрымку абвешчанай беларускай дзяржаўнасці, усталявала цесныя гандлёвыя сувязі. Аднак дыпламатычнае прызнанне БНР украінскім урадам не было здзейснена па прычыне нявырашанасці

беларускага пытання краінамі Антанты, нежадання кіруючых колаў Украіны ўвайсці ў канфліктныя адносіны з урадам Германіі і Савецкай Расіі, а таксама з прадстаўнікамі "белай" Расіі.

---

[1] *Краўцоў Макар.* Рада Беларускай Народнай Рэспублікі. Вільня, 1921. С.18.
[2] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), ф.325, воп 1, спр.46, арк.121.
[3] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі .Т.І, Кніга І. Вільня-Нью-Ёрк-Менск-Прага. 1998. С.103.
[4] Там жа, с.109.
[5] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т.І, Кніга І. С.95.
[6] Вольная Беларусь 1918. №16.
[7] Гоман, 1918. №79.
[8] Новый вестник, 1918. 30 сентября.
[9] *Луцкевіч А.* Дзённік // Полымя. 1991. № 5. С.188.
[10] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т.І, Кніга І. С.291.
[11] НА РБ, ф.4, воп.3, спр. 842, а.1.
[12] *Пономаренко П.К.* События моей жизни // Неман, № 3, 1992. С.157.